# 21-22 МАЯ Ў НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БІБЛІЯТЭЦЫ БЕЛАРУСІ АДБУДЗЕЦЦА НАВУКОВАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ «ГЕНЕАЛОГІЯ, ГЕРАЛЬДЫКА І ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ШЛЯХТЫ»

**21—22 мая ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі пройдзе навуковая канферэнцыя «Генеалогія, геральдыка і гісторыя беларускай шляхты». Яе арганізатар — Аб'яднанне беларускай шляхты (АБШ).**

На канферэнцыі будуць разглядацца як агульныя праблемы гісторыі беларускага шляхецтва, так і паходжанне асобных родаў і сем'яў. У нацыянальнай гісторыі зафіксавана некалькі тысяч шляхецкіх родаў, якія бяруць свой пачатак у XIV стагоддзі, а княжацкія — яшчэ раней. Зараз АБШ аб'ядноўвае ў сваіх шэрагах некалькі соцень патомкаў прадстаўнікоў беларускай шляхты.

Старшынёй аргкамітэта канферэнцыі з'яўляецца вядомы беларускі вучоны, доктар гістарычных навук, прафесар Анатоль Грыцкевіч, які адначасова выконвае абавязкі вялікага маршалка Аб'яднання беларускай шляхты.

**Вольга КРАЦЯНКОВА, БелаПАН.**